# СА СВЯТАМ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА!

СЛАВА ВЯЛІКАМУ КАСТРЫЧНІКУ, ЯКІ АДКРЫЎ НОВУЮ ЭПОХУ Ў ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА — ЭПОХУ ПЕРАХОДУ АД КАПІТАЛІЗМУ ДА САЦЫЯЛІЗМУ І КАМУНІЗМУ!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 68-й гадавіны Вялікага Кастрычніка).

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 29 (623) | Серада, 6 лістапада 1985 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап




## НАПЕРАД ДА НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ!

Дарагія таварышы!

У абстаноўцы выключнага працоўнага і палітычнага ўздыму савецкія людзі сустракаюць знамянальнае свята — 68-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Небывалы прыліў творчых сіл і энергіі, усенароднае імкненне да захавання міру на зямлі, раззбраення і далейшага прагрэсу выклікалі рашэнні кастрычніцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС, вынесены на шырокае абмеркаванне ўсіх камуністаў і працоўных СССР праект новай рэдакцыі Праграмы КПСС. У гэтым гістарычнай важнасці дакуменце з усёй паўнатой і яснасцю адлюстраваны велічныя перспектывы эканамічнага і сацыяльнага развіцця першай у свеце Краіны Саветаў.

Сёлетняе свята Вялікага Кастрычніка папярэднічае фінішу дванаццатай пяцігодкі, прадстаячым XXVII з'езду КПСС і XXX з'езду Кампартыі Беларусі. У падрыхтоўцы дастойнай сустрэчы партыйных форумаў падсумоўваюцца вынікі бягучай пяцігодкі, мабілізуюцца наяўныя рэзервы і магчымасці для дасягнення яшчэ больш высокіх паказчыкаў у эканоміцы і ўсіх сферах нашага сацыялістычнага жыцця.

З першых гадоў Савецкай дзяржавы стала добрай традыцыяй у гонар слаўнай рэвалюцыйнай даты рапартаваць любімай Радзіме, роднай Камуністычнай партыі аб дасягнутых працоўных здабытках. Сёння ёсць аб чым сказаць і шматтысячнаму калектыву нашага універсітэта. Ім зроблены яшчэ адзін прыкметны крок на шляху далейшага ўдасканальвання вышэйшай і сярэдняй адукацыі, камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі, развіцця навуковых даследаванняў і ўкаранення атрыманых вынікаў у вытворчасць.

Прыемна сказаць, што да 68-ай гадавіны Вялікага Кастрычніка выканана сацыялістычнае абавязацельства па падрыхтоўцы і абароне кандыдацкіх дысертацый. Пры прадугледжаных 61 абаронены ўжо 62 кандыдацкія дысертацыі. Да канца пяцігодкі гэта ліба яшчэ некалькі ўзрасце. Перавыканана таксама пяцігадовае заданне па аб'ёму праведзеных навуковых распрацовак па дзяржбюджэту і гаспадарчых дагаворах і іх эканамічнаму эфекту.

Шмат выдатных спраў на рахунку студэнтаў. Пераважная большасць з іх не толькі настойліва авалодвае выбранымі спецыяльнасцямі, але і актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці, патрыятычным будаўнічым руху. У гэтай пяцігодцы рукамі выхаванцаў нашага універсітэта асвоена амаль 7 млн. рублёў капіталаўкладанняў.

Плённа працуюць студэнты і на сельгасработах. Сёлета на нарыхтоўцы кармоў, уборцы ўраджаю, пры выкананні іншых неадкладных работ яны аказалі вялікую дапамогу гаспадаркам Веткаўскага, Жлобінскага, Жыткавіцкага і Петрыкаўскага раёнаў. Сельгасатрад першакурснікаў «Рытм» з гісторыка-філалагічнага факультэта — адзін з пераможцаў абласнога сацыялістычнага спаборніцтва 1985 г.

Горача віншуем выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў, аспірантаў, увесь калектыў універсітэта са святам Вялікага Кастрычніка! Жадаем вам, дарагія таварышы, добрага здароўя, асабістага шчасця і новых поспехаў у працы і вучобе на карысць нашай любімай сацыялістычнай Айчыны!

РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, ПРАФКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.

## УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР

Пазаўчора ў актавай зале адбыўся ўрачысты вечар калектыву універсітэта, прысвечаны 68-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

З дакладам выступіў загадчык кафедры філасофіі, доктар філасофскіх навук, прафесар У. М. Калмыкоў.

На вечары быў зачытаны загад, у якім рэктар, акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць павіншаваў выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў са святам Вялікага Кастрычніка, а тым, хто дасягнуў лепшых паказчыкаў у працы і вучобе, вызначыўся актыўнасцю у грамадскім жыцці, аб'явіў падзяку.

Вечар завяршыўся канцэртам мастацкай самадзейнасці.

Калектыў нашага універсітэта, як і ўсе савецкія людзі, з вялікай цікавасцю сустрэў дакумент гістарычнага значэння — новую рэдакцыю Праграмы КПСС, праект якой апублікаваны ў друку. Цяпер ажыўлена вядзецца яго абмеркаванне.

## БЫЦЬ НА ВЯДУЧЫХ ПАЗІЦЫЯХ

У праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС запісана, што «савецкая навука заклікана займаць вядучыя пазіцыі па асноўных напрамках навукова-тэхнічнага прагрэсу, знаходзіць эфектыўныя і своечасовыя вырашэнні перспектыўных і бягучых вытворчых і сацыяльна-эканамічных праблем». Усё гэта самым непасрэдным чынам адносіцца да кожнага вучонага і навуковага супрацоўніка.

У пастаянным навуковым пошуку знаходзіцца калектыў фізічнага факультэта. Яго выкладчыкамі і супрацоўнікамі штогод выконваецца значны аб'ём навуковых даследаванняў, якія маюць вялікае народнагаспадарчае значэнне.

Разам з тым свае магчымасці мы выкарыстоўваем яшчэ не ў поўнай меры. Жадае быць значна вышэйшай эканамічная эфектыўнасць асобных навуковых распрацовак. Не заўсёды своечасова яны ўкараняюцца ў вытворчасць.

Каб быць на ўзроўні пастаўленых партыяй задач, неабходна карэнным чынам палепшыць вынаходніцкую і ліцэнзійную работу. Трэба змагацца за тое, каб кожнае вынаходніцтва знаходзіла практычнае прымяненне, давала максімальны эканамічны эфект.

М. КАЗАКОЎ,
дацэнт кафедры фізічнай метралогіі.

## КАНКРЭТНАЙ СПРАВАЙ

Для нас — эканамістаў — найбольшую цікавасць выклікалі тыя перспектывы, якія прадугледжаны Праграмай КПСС у галіне развіцця савецкай эканомікі, паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, удасканальвання сістэмы кіравання і метадаў гаспадарання. У прыватнасці, велізарнае значэнне для далейшага эканамічнага развіцця мае нацэленасць работы на «радзікальнае паляпшэнне выкарыстання прыродных рэсурсаў, сыравіны, матэрыялаў, паліва і энергіі ва ўсіх стадыях — ад здабычы і комплекснай перапрацоўкі сыравіны да выпуску і выкарыстання канчатковай прадукцыі».

Наша кафедра, выконваючы даследаванні па бюджэтнай і гаспадарчай тэматыцы, распрацоўвае эканамічна-арганізацыйныя меры па паляпшэнню выкарыстання ў народнай гаспадарцы рэспублікі каляровых металаў, лясных рэсурсаў, драўніннага і іншых відаў сыравіны і матэрыялаў. Задачы, пастаўленыя Праграмай КПСС, пацвярджаюць значнасць нашай работы. І мы павінны прыкладаць усе намаганні па хутчэйшай іх рэалізацыі.

Г. КОЎЗІК,
партгрупорг кафедры галіновых эканомік.




На здымку: праект новай рэдакцыі Праграмы КПСС са студэнтамі гр. БР-33 гістфіла абмяркоўвае куратар групы, дацэнт кафедры беларускай мовы Л. І. Злобін.

Фота У. Чысціка.

# АКТЫВІЗАВАЦЬ ТВОРЧЫ ПОШУК

Калегія Мінвуза БССР і Прэзідыум Беларускага Савета Усесаюзнага таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў падвялі вынікі конкурсу на лепшую пастаноўку вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай работы ў вышэйшых навучальных установах рэспублікі за мінулы год. У аглядзе прынялі ўдзел 8 тэхнічных ВНУ і 3 універсітэты.

У ходзе агляду вышэйшымі навучальнымі ўстановамі зарэгістравана 1271 вынаходніцтва, з іх укаранёна 371 з эканамічным эфектам 20,4 мільёна рублёў. У сярэднім па міністэрству 70 са 100 пададзеных заявак прызнаны вынаходніцтвамі. Дзесяткі студэнтаў сталі вынаходнікамі. Актывізавалася патэнтна-ліцэнзійная работа. У мінулым годзе была прададзена адна ліцэнзія і падпісаны адзін кантракт, праводзілася актыўная рэклама дзесяткаў распрацовак. За мяжой патэнтуецца звыш 150 вынаходніцтваў.

За высокія вынікі ў вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай рабоце пераможцамі сярод ВНУ краіны прызнаны Беларускі політэхнічны і Беларускі тэхналагічны інстытуты. Яны заахвочаны грашовымі прэміямі.

Сярод ВНУ БССР лепшымі па пастаноўцы вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай работы прызнаны адпаведна Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут і Наваполацкі політэхнічны інстытут. Пераможцам прысуджаны грашовыя прэміі. Астатнія месцы ў адпаведнасці з сумамі набраных балаў размеркаваліся наступным чынам: 4-е месца— Беларускі дзяржаўны універсітэт, 5-е — Гомельскі політэхнічны інстытут; 6-е— Магілёўскі тэхналагічны інстытут; 7-е — Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут; 8-е — Гродзенскі дзяржаўны універсітэт; 9 — Гомельскі дзяржаўны універсітэт.

Нізкая рэзультатыўнасць і эфектыўнасць вынаходніцкай работы, нездавальняючы стан патэнтна-ліцэнзійнай работы, слабае развіццё вынаходніцкай творчасці студэнтаў — вось тыя прычыны, якія не дазваляюць нашаму універсітэту на працягу многіх гадоў заняць больш высокае месца ў аглядзе вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай работы.

Карэннае паляпшэнне гэтай работы павінна быць у цэнтры ўвагі партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый, кафедр, навуковых лабараторый, факультэтаў ГДУ.

**М. ЯРМАЛКЕВІЧ,**
**кіраўнік патэнтнай групы ГДУ.**

*Пытанне патрабуе вырашэння*

# ЯКОЙ ЖА БЫЦЬ ДРУЖЫНЕ?

**Быў час, калі ў газеце «Гомельскі універсітэт» рэгулярна выходзілі старонкі «Прырода і ты», якія рыхтавалі члены Дружыны па ахове прыроды ГДУ. Яны расказвалі аб той вялікай прапагандысцкай і аператыўнай рабоце, якую праводзіла Дружына. Пазней такіх старонак не стала. Можа не існавала болей гэтага добраахвотнага аб'яднання энтузіястаў — абаронцаў прыроды? Адказаць на гэта пытанне адназначна нельга. Існаваць яно працягвала, толькі ўжо далёка не такім, якім было на пачатку сваёй дзейнасці. Мяняўся састаў Дружыны, яе кіраўніцтва, мяняліся і адносіны да яе з боку вышэйстаячых арганізацый.**

**Сёння сваімі думкамі аб складаным становішчы ў Дружыне па ахове прыроды, прычынах заняпаду яе дзейнасці дзеліцца член Дружыны Валянціна Карніевіч.**

Дружына нашага універсітэта была ўтворана ў 1972 годзе. У красавіку ёй споўніцца ўжо 14 гадоў. З самага пачатку ў састаў Дружыны ўваходзілі студэнты толькі біяфака, з цягам часу ў яе рады ўліліся добраахвотнікі і з іншых факультэтаў. Потым на геафаку ўтварыўся аператыўны атрад для барацьбы з браканьерствам. Члены Дружыны разам з аператыўным атрадам праводзілі сумесныя рэйды па прадухіленню знішчэння прыродных багаццяў.

З таго часу прайшло 13 гадоў. Але і па сённяшні дзень Дружына застаецца яшчэ малалікай. Гэта можна было б растлумачыць тым, што на біялагічным факультэце вучацца ў асноўным дзяўчаты, юнакоў мала. Праўда, так было і раней. Тым не менш рэгулярна праводзіліся рэйды па барацьбе з браканьерамі, са спустошальнікамі лясных палян, якія ўносілі з сабой пахнюткія кашолкі першых кветак, многія віды якіх занесены ў Чырвоную кнігу краіны. Вялася непрымірымая барацьба і з тымі, хто незаконна ссякаў ёлачкі перад навагоднімі святамі, каб прадаваць іх з мэтай нажывы. Цяпер жа арганізаваць такія рэйды стала проста немагчыма з-за пасіўнасці і раўнадушша студэнтаў-біёлагаў, а таксама тых арганізацый, якія б маглі ім у гэтай справе дапамагчы.

З кожным годам усё менш і менш знаходзіцца сярод студэнтаў добраахвотнікаў з гарачым жаданнем абараняць нашу цудоўную прыроду ад неразумнага ў яе ўмяшання чалавека. Цяпер толькі 10 (!) чалавек у саставе Дружыны. Такая статыстыка, зразумела, насцярожвае і наводзіць на трывожны роздум. На пытанне, якое мы задаем студэнтам біяфака: «Чаму не становішся членам Дружыны па ахове прыроды?», чуем адказы: «А прычым тут я?..», «Ніхто не гаварыў...» або «Часу не хапае: вучоба, асабістыя справы...»

Дзіўная пазіцыя ў адносінах да работы Дружыны выявілася і ў камсамольскай арганізацыі біяфака. На справаздачна-выбарным камсамольскім сходзе факультэта, які адбыўся 25 кастрычніка, варта было б не толькі між іншым закрануць пытанне аб Дружыне, а ўсебакова, дэталёва абмеркаваць яго, каб знайсці канкрэтныя рашэнні ўсіх яе наспелых праблем.

Адзін толькі напамін аб Дружыне выклікае ў некаторых на факультэце незадаволеную грымасу, як ад зубнога болю. У яе адрас прагучалі нават такія словы: «Разагнаць трэба вашу Дружыну, усё роўна нічога не робіце, а стварыць новую...» А якую? Зразумела, крытыкаваць лягчэй, чым рабіць штонебудзь па актывізацыі і паляпшэнню яе дзейнасці. Іншы раз у нас паўстаюць пытанні: «Ці патрэбна наогул такая арганізацыя студэнтаў — Дружына па ахове прыроды? Можа без яе было б спакойней, не ўзнікала б непрыемных канфліктаў?»

Пытанняў нямала. І на іх хацелася б пачуць канкрэтныя адказы.

**В. КАРНІЕВІЧ,**
**член Дружыны,**
**студэнтка 4-га курса біяфака.**

**АД РЭДАКЦЫІ: на гэтым мы не ставім кропку ў размове аб рабоце Дружыны па ахове прыроды. Спадзяемся, што на старонках газеты выкажуць свае меркаванні, думкі, прапановы выкладчыкі, студэнты як біяфака, так і іншых факультэтаў ГДУ.**

*Конкурсы мастацкай самадзейнасці*

# ЖАДАЕМ ПОСПЕХАЎ!

З першых месяцаў вучобы ва універсітэце першакурснікі павінны стаць актыўнымі ўдзельнікамі грамадскага і культурнага жыцця свайго факультэта, універсітэта. Выявіць іх здольнасці і схільнасці дапамагаюць традыцыйныя конкурсы мастацкай самадзейнасці «Ану, першакурснікі!» Іх можна назваць своеасаблівай генеральнай рэпетыцыяй перад больш адказным выпрабаваннем — удзелам у агульнауніверсітэцкім конкурсе-аглядзе талентаў першакурснікаў.

3-га лістапада сцэна актавай залы універсітэта прымала самадзейных спевакоў і танцораў, музыкантаў і чытальнікаў з усіх факультэтаў. А перад гэтым сваю падрыхтаванасць да яго першакурснікі паказалі ў час конкурсаў на сваіх факультэтах.

Адбыўся конкурс «Ану, першакурснікі!» і на эканомфаку. Спачатку ўражанні ва ўсіх яго гледачоў ад выступленняў першых груп — Т-11, 0-11 былі не зусім добрыя. Адчувалася недастатковая падрыхтаванасць першакурснікаў, іх скаванасць і нясмеласць. Нумары праграм гэтых груп за выключэннем выступлення танцавальнага калектыву і выканаўцаў песні Н. Пархоменка і Н. Багданава (гр. 0-11), не заслугоўвалі высокай ацэнкі. Крыху больш удалым было выступленне студэнтаў групы Т-13. Ларыса Свістунова была ўзнагароджана граматай за лепшае выкананне верша В. Бяргтольц, спадабаўся гледачам таксама нумар «Гучаць цымбалы», з якім выступіла Вольга Харанека.

Апошнімі паказвалі свае таленты першакурснікі групы Т-12. Нечакана іх выступленне пераўзышло ўсе спадзяванні. Яно было добра арганізаваным і зладжаным. Вясёлая, змястоўная праграма прынесла многім нямала прыемных мінут. Былі паказаны цікавыя сцэнкі «Экзамен», «Бог стварае студэнта». Лепшым вядучым быў прызнаны С. Кажамякін. Наогул, ён праявіў высокую актыўнасць, прымаў удзел амаль ва ўсіх нумарах праграмы: выконваў песні, іграў на гітары. Заслужана група Т-12 стала пераможцай конкурсу.

Вялікую дапамогу аказалі першакурснікам пры падрыхтоўцы да канцэрта студэнты старэйшых курсаў А. Мяжэннікава, А. Заяц, А. Санкоўскі, А. Андросік, В. Ігнатаў.

**І. НЕШЫК,**
**студэнтка 4-га курса эканамічнага факультэта,**
**старшыня прэс-цэнтра.**



АПОШНЯЕ ЛІСЦЕ.

Фота У. Чысціка.

## На кніжнай паліцы

# ВЫДАДЗЕНА Ў БЕЛАРУСІ

У кніжным магазіне № 19 ёсць у продажы літаратура, выпушчаная рэспубліканскімі выдавецтвамі. Яе могуць набыць выкладчыкі, студэнты ГДУ.

**ЛЕПЕШАЎ І. Я.** Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы.— Мн: Навука і тэхніка, 1984.

У кнізе даследуецца ў стылістычным плане фразеалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Аналізуюцца спецыяльныя разрады і стылістычныя функцыі фразеалагічных адзінак.

Кніга разлічана на навуковых работнікаў, выкладчыкаў ВНУ і студэнтаў, настаўнікаў, пісьменнікаў, журналістаў.

**ХРЭСТАМАТЫЯ па беларускай савецкай літаратуры.** У 2-х частках. Склад. А. М. Налівайка. — Мн: Вышэйшая школа, 1984.

Кнігу складаюць важнейшыя мастацкія творы Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, К. Чорнага, А. Лынькова, М. Танка, І. Шамякіна, І. Мележа, В. Быкава, А. Макаёнка і інш., прадугледжаныя праграмай па курсу «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры».

**МУШЫНСКІ М. І.** Беларуская крытыка і літаратуразнаўства.

У кнізе даследуюцца шляхі і вядучыя тэндэнцыі развіцця беларускай крытыкі і літаратуразнаўства.

Разлічана на філолагаў, выкладчыкаў літаратуры.

**Руска-беларускі слоўнік у 2-х тамах. — Мн.,** Белорусская Советская Энциклопедия, 1982.

Кніга разлічана на масавага чытача і спецыялістаў.

**ЯНКОВА Т. С.** Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны. — **Мн.,** Навука і тэхніка, 1982.

У слоўніку падаецца каля сямі тысяч слоў, запісаных за два дзесяцігоддзі ў Лоеўскім раёне Гомельскай вобласці. Шырока паказана народная фразеалогія.

Разлічан на мовазнаўцаў і этнографаў, пісьменнікаў і журналістаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ.

**Н. ШАТОН,**
**прадавец магазіна.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

Рэктарат, партком і грамадскія арганізацыі універсітэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці выдатнага савецкага матэматыка, дырэктара Гомельскага аддзялення Інстытута матэматыкі АН БССР, заслужанага дзеяча навукі БССР, акадэміка АН БССР, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара ЧУНІХІНА Сяргея Антонавіча і выказваюць глыбокае спачуванне жонцы памёршага.

Калектыў ІВЦ выказвае глыбокае спачуванне старшаму інжынеру КАДОЛ Таццяне Паўлаўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.

АЗ 42361

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР на справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, к. 3-11, т. 57-16-52.
Заказ 2040